**У галерэі "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўжо другі год запар праходзіць Міжнародная выстава сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў "Грані творчасці". Арганізатарамі праекта выступілі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Нагадаем, што ў мінулым годзе ў цэнтры ўвагі студэнтаў — удзельнікаў праекта "Грані творчасці" была постаць Максіма Багдановіча. Сёлета, з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, як і варта было чакаць, студэнцкія творчыя думкі і памкненні сканцэнтраваліся вакол асобы і дзейнасці Францыска Скарыны, і гэта красамоўна засведчыла тэма-дэвіз экспазіцыі гэтага года: "Францыск Скарына. Чалавек дасканалы". Сімвалы, сімвалы, паўсюль нас акружаюць сімвалы. А ў "Гранях творчасці" ў гэты раз было асабліва многа сімвалаў: "Грані творчасці" — у шматгранным алмазе НББ, шматгранная асоба Скарыны — у "Гранях творчасці", нарэшце, візуалізаваны студэнтамі Скарына — у бібліятэцы, зайсці ў якую запрашае на вуліцы Скарына манументальны...**



Удзельнікаў праекта "Грані творчасці" вітае намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Т.Н.Якубовіч.



Дар'я Сінкевіч, Аляксандра Сінкевіч, Кацярына Шпанькова (ГДУ імя Францыска Скарыны). "Праз жыццё да ведаў".

янальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Таццяна Раманаўна Якубовіч: "Наша задача сёння — разам з моладдзю захоўваць і развіваць духоўную спадчыну краіны. Гэта павінна стаць нашым абавязкам. Паглядзеўшы гэтую выставу, у якой прынялі ўдзел студэнты 32 устаноў вышэйшай адукацыі, я магу з упэўненасцю сказаць, што ў нашай краіне ёсць будучыня. Безумоўна, мы сёння павінны дакрануцца яшчэ раз да жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны, які 5 стагоддзяў назад заявіў усёй Еўропе, што ёсць робім усё, каб свята беларускага кнігадрукавання стала падзеяй не толькі нацыянальнага, але і міжнароднага значэння, каб наша краіна магла паўнацэнна заявіць пра свае дасягненні, свае набыткі, свой патэнцыял. А сёння я больш чым

# Прызнанне ў любові

## Што кажуць нам "Грані творчасці"?

Ужо само адкрыццё экспазіцыі было не проста ўрачыстым, прыгожым святам, а відавочным пасылам арыгінальнасці і той дасканаласці, пра якую гаворыцца ў тэме-дэвізе выставы.

Гэта і бліскучае пранікнёнае выступленне з неўміручым "Ойча наш" камернага складу харавой капэлы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кіраўнік Вольга Юр'еўнага Мінянкова), і лірычныя спевы студэнта Інстытута сучасных ведаў імя А.М.Шырокага Вадзіма Авіжыча, які выканаў "Каля Чырвонага касцёла" і "Князёўну", і надзвычай сімвалічныя паэтычныя творы ("Францішку Скарыну" Кастуся Жука, "Кніга"



пераасэнсаванне свету, пераасэнсаванне нашай культуры".

Цудоўнай фішкай адкрыцця экспазіцыі "Грані творчасці" стаў момант, калі прафесіяналам з ліку экспертаў праекта, якія падыходзілі да мікрафона, была прадастаўлена магчымасць не проста звярнуцца да прысутных, а зачытаць знакавыя словы Францыска Скарыны: "Кніга (Біблія) — люстэрка людскога жыцця і душэўныя лекі, уцеха — самотным, зняверaным — помач, і асабліва тым, каго немач точыць і верад

ных ведаў імя А.М.Шырокага Вад-
Авіжыча, які выканаў "Каля Чырвонага касцёла" і "Князёўну", і надзвычай сімвалічныя паэтычныя творы ("Францішку Скарыну" Кастуся Жука, "Кніга" Максіма Багдановіча, "Благаславенны край..." Ларысы Геніюш, урывак з паэмы "Беларуская калыханка" Васіля Віткі, "Мара Скарыны" Ніла Гілевіча), якімі перамяжоўваўся тэкст вядучых, і сам тэкст вядучых, і прывітальныя словы шаноўных гасцей, запрошаных на адкрыццё экспазіцыі. Прыгадаем, што гаварылі некаторыя з іх.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацы-



Камерны склад харавой капэлы БДУ выконвае "Ойча наш".

га (Біблія) — люстэрка людскога жыцця і душэўныя лекі, уцеха — самотным, знявераным — помач, і асабліва тым, каго немач точыць і верад рушыць"; "Любіце кнігу, бо яна крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы"; "Найдаражэйшыя скарбы — чалавечыя словы, натхнёныя Богам і выслаўленыя да Бога"; "Ніякай працы і скарбаў ніякіх не шкадуйце для паспалітай карысці для айчыны сваёй"; "У добрых справах і ў любасці да Айчыны ўпадабняйцеся".





Студэнтка БДУКіМ Таццяна Талай і яе арыгінальная інсталяцыя.

такі народ — беларусы. Гэта сапраўды быў чалавек слова і справы. А мы з вамі сваёй працай: хтосьці як студэнт, хтосьці як супрацоўнік таго ці іншага ўніверсітэта — павінны ўмацоўваць і развіваць нашу краіну. І, канечне, наша краіна павінна быць моцнай і квітнеючай".

Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Аляксандравіч Суша: "Я рады шчыра вітаць удзельнікаў гэтай выставы, якая разгарнулася ў сценах нашай бібліятэкі. Як вы разумееце, для нас свята беларускага кнігадрукавання — гэта не чарговае свята, не чарговая падзея. Мы шчаслівы глядзец на гэтую выставу. Я бачу цудоўную культурную рэвалюцыю, якая адбываецца сёння для нашых знакавых персон мінулага. Што я маю на ўвазе? Быў перыяд, калі мы ўзводзілі высокія помнікі выбітным асобам гісторыі. Быў перыяд, калі мы стваралі грунтоўныя манаграфіі, прысвечаныя Францыску Скарыну. Быў перыяд, калі яго творчасць апявалася ў цудоўнай паэзіі. Але час мяняецца. І сёння мы маем справу з абсалютна новым пераасэнсаваннем мінуўшчыны і абсалютна новымі спробамі звязаць сябе з нашай спадчынай, пераадкрыць яе праз сябе і паказаць, што яна мае патэнцыял для далейшага развіцця. І сёлетняя выстава — найлепшы прыклад, найлепшы доказ таго, што наша спадчына мае такі патэнцыял. Я абсалютна рады, што сёння кожны малады чалавек можа сказаць пра Скарыну сваё слова і праз яго паказаць сваю прысутнасць у свеце нацыянальнай культуры, сваю сувязь з гэтым вялікім чалавекам... Вось ён, я, на фоне нашай спадчыны — гэтыя словы можна прымаць як дэвіз выставы. Не трэба баяцца таго, што студэнты выказваюцца пра Скарыну менавіта праз сябе, як могуць і як умеюць. Гэта не нізкі ўзровень. У сітуацыі постмадэрнізму, у якой мы жывём, няма першых і апошніх. Усе мы розныя, і ў гэтым наша багацце і каштоўнасць. Нізкі паклон вам, творцы, за

## Што кажуць студэнты?

Да гонару непасрэдных арганізатараў сёлетняй экспазіцыі (найперш за-



Настасся Воўк (Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П.Шамякіна). "Зоркі".

гадчыка аддзела сацыякультурных праектаў навучэнскай і студэнцкай моладзі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Алены Сяргееўны Лаўрыновіч і метадыста вышэйшай катэ-

# дасканаламу чалавеку

горыі гэтага аддзела Таццяны Валер'еўны Грышукевіч), намінацыі выставы былі настолькі арыгінальнымі, што прымушалі здзіўляцца і экспертаў, і супрацоўнікаў НББ, і журналістаў.

Колькі слоў пра кожную намінацыю.

"Летэрынг — "Я, Францішак, Скарынін сын...". Аснову творчай працы ў гэтай намінацыі складае выкананае ў тэхніцы "летэрынг" (літаральна — "маляванне словамі", тэхніка выканання, у якой тэкст, графічныя формы і рашэнні з'яўляюцца мастацкімі аб'ектамі) творчае асэнсаванне цытаты Ф.Скарыны "...і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць".

"Буквіца — "Друкаванае слова. Вялікія літары". Тут неабходна было прадставіць ілюстрацыі твораў, прысвечаных беларускімі пісьменнікамі ў выглядзе малюнкаў з арнаментальна-дэкаратыўнай ці сюжэтнай кампазіцыяй, якая разгортваецца вакол "Буквіцы" ("ініцыял", першая вялікая літара тэксту) і адлюстроўвае змест канкрэтнага літаратурнага твора.

"Фота-альтэрнат — "Крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы". Ад канкурсантаў праекта патрабавалася стварыць фотаработу з самай старой кнігай з асабістай хатняй бібліятэкі або бібліятэкі знаёмых людзей. Фотаздымак мусіў быць выкананы з выкарыстаннем сучасных кірункаў лічба-



Студэнт Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта Раман Сварабовіч і яго серыя фотаработ "Людзі на балоце".

І некалькі красамоўных прыкладаў творчасці студэнтаў.

Таццяна Талай, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, акрамя фотаздымкаў, на выставе прадставіла цэлую інсталяцыю з уласнымі рукапіснымі кнігамі і старадаўнімі фаліянтамі з хатняй бібліятэкі. Пра свой праект Таццяна, у прыватнасці, расказвае наступнае: "Кожны чалавек чэрпае натхненне з каштоўнасцей, непадуладных часу. Як існуе вечны горад Рым, так існуе і вечная кніга — Біблія. Менавіта да яе я звярнулася, калі пачула, як дзіця запытала ў сваёй мамы:






якую ён прачытаў, і з таго часу імкнецца зацёды размаўляць на роднай мове.

Адной з самай цікавых на выставе можна смела лічыць работу "Малітоўнік" Яна Лысага з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: мы бачым дзяўчынку са свечкай "у абдымках" старадаўняй кнігі. "Гэта камбінаваныя здымкі, — тлумачыць Ян. — А гэты "Малітоўнік" 1880 года аказаўся самым старым у той сям'і, у якой расце гэтая дзяўчынка. Я толькі потым даведаўся, што я фатаграфаваў і яе, і "Малітоўнік" у папяльцовую сераду, калі пачынаецца Вялікі пост".

## Што кажуць эксперты?

Дырэктар Выдавецкага дома "Мэджык" Юрый Іосіфавіч Будзько: "Шрыфтавая графіка — самы складаны кірунак графічнага мастацтва, таму можна толькі ўявіць, з якімі складанасцямі сутыкнуліся канкурсанты. Тым не менш я ўбачыў тут рабо-

ецца. Гэта менавіта тое, што я хацеў бачыць на выставе. Тое, што нейкая ідэя — адна, але ўяўленні пра яе — розныя. І мне здаецца, што многія канкурсанты справіліся з гэтай задачай".

Загадчык аддзела сацыякультурных праектаў навучэнскай і студэнцкай моладзі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Алена Сяргееўна Лаўрыновіч: "У намінацыі "Буквіца" істотна тое, што канкурсантам патрэбна было як бы разгадваць сам тэкст, выходзячы з буквіцы. Гэта нагадвае адмысловы квест, рэбус. Мне здаецца, мы дазволілі маладым людзям, якія жывуць праз 500 гадоў пасля таго, як Скарына надрукаваў сваю Біблію, сваім жа новым прачытаннем, нават не прачытаннем, а напісаннем падзеі, зразумець гэтую падзею. А ў намінацыі "Летэрынг" для мяне быў асаблівы дарагі сам сэнс напісанай літары, тое, што мы акунулі студэнтаў у напісанне старадаўніх літар. Кожнаму студэнту было прапанавана вынайсці свой шрыфт, і яны рэалізавалі гэтую ідэю ў рамках нашай выставы".

Метадыст вышэйшай катэгорыі аддзела сацыякультурных праектаў навучэнскай і студэнцкай моладзі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Таццяна Валер'еўна Грышукевіч: "Праект "Грані творчасці" — гэта не проста магчымасць





Ян Лысы з Акадэміі мастацтваў і яго “Малітоўнік”.




вай творчасці (3D-візуалізацыі, time lapse, selfie, true eye, wild camerawork і г.д.).

“Візуальны сэт — “Vade mecum: там ёсць вялікая тайна”. Vade mecum у перакладзе з лацінскай мовы азначае “ідзі за мной”. Работы ў гэтай намінацыі — своеасаблівыя падарожныя кніжкі, праваднікі па жыццёвых і асветніцкіх шляхах Фран-



Алеся Смалякова (ПДУ). “Літара Д”.

цыска Скарыны. У творчых работах, выкананых у розных тэхніках выяўленчага мастацтва (жывапіс, графіка, акварэль, сфумата, зграфіта, грызайль і інш.), візуалізуюцца месцы, аб'екты, культавая архітэктура, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Францыска Скарыны.

“Чаму ў тыдні 7 дзён?” Мне захацелася адказаць не толькі гэтаму хлопчыку, але і іншым дзецям словамі з Бібліі, але ў форме, даступнай для дзіцячага ўспрымання, каб гэта было цікава, маляўніча і крышачку таямніча, каб за кожнай старонкай была схавана нейкая загадка ці рэбус. У маёй першай рукапіснай кніжцы для дзяцей ёсць старонкі з рыбамі (гэта, як вядома, сімвал першых хрысціян), а вокладка выканана ў выглядзе райскай брамы... Я думаю, што ў гэтай рукапіснай кнізе ўвасобілася мая дзіцячая мара пра тую кніжку, якую мне самой хацелася б не толькі пачытаць, але і пагартаць, а таксама пафантазіраваць пра тое, чым яна магла б закончыцца... А на другую кнігу мяне натхніла самае цудоўнае пачуццё, якое, быццам рэха, паўтараецца і ў самім тэксце, і на вокладцы, — каханне. Каханне, любоў для мяне — гэта Божае прадбачанне і натхненне для новых творчых спраў”.

Раман Сварабовіч, студэнт Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, прадставіў серыю фотаздымкаў, выкананых у тэхніцы так званай інтэрвальнай здымкі: на кожным фота мы бачым маладога чалавека (гэта сам Раман), які ў розных позах чытае твор Івана Мележа “Людзі на балоце”. Студэнт прызнаецца, што гэтая кніга была першай кнігай на беларускай мове, таму можна толькі ўявіць, з якімі складанасцямі сутыкнуліся канкурсанты. Тым не менш я ўбачыў тут работы, у якіх студэнтам удалося асучасніць старадаўнія шрыфты. У прыватнасці, у мяне выклікала захапленне работа Кацярыны Івановай з Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. І нават тое, што многія ўдзельнікі выставы імкнуліся капіраваць шрыфты Скарыны, таксама можна толькі вітаць. Такім чынам яны з дапамогай мастацкіх сродкаў акуналіся ў гісторыю”.

Сябар Беларускага саюза мастакоў, сябар Беларускага саюза дызайнераў, шэфрэдактар часопіса ТАХІ Сяргей Уладзіміравіч Сцельмашонак: “Можна згадаць пошукавую сістэму Google. Усе мы ведаем, што Google кожны дзень розны, але ўсё роўна ён пазна-




Хрысціна Мацюшэнка (БДУТ). “Prague”.



Кацярына Іванова (ВДТУ). “Я, Францішак, Скарынін сын...”.

намаляваць або сфатаграфаваць. Фатаграфуюць сёння ўсе. Гэты праект асабліва каштоўны тым, што ён асветніцкі — у тым плане, што ў яго намінацыях, калі ў іх уважліва ўчытацца, закладзены вельмі глыбокі сэнс. Колькі студэнтаў яшчэ ўчора ведалі пра такое слова, як летэрынг? Дый нават не ўсе, я думаю, ведалі, што такое буквіца. Мы нібы падняллі гэтыя словы, адкрылі гэтыя панцыі для сучаснай моладзі і тым самым у пэўным сэнсе адкрылі для яе старажытную пісьмовую культуру”.

* * *

*Міжнародная выстава сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў будзе экспанавацца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі да 10 жніўня. Потым, у верасні — снежні 2017 года, яе прымуць Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Палескі дзяржаўны ўніверсітэт. Завершыцца гэтае падарожжа ў Лідзе, дзе знаходзіцца адзін з помнікаў Францыску Скарыну. Фінальная экспазіцыя будзе прадстаўлена ў Лідскім каледжы Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.*

*Ці можна прызнавацца ў любові даскаламу чалавеку Францыску Скарыну, які зрабіў немагчымае, тое, што нават не ўкладваецца ва ўяўленні сучаснага чалавека? Ці яго як асобу і яго спадчыну можна толькі пераасэнсоўваць, толькі вывучаць? Рытарычныя пытанні. Але мне падаецца, што пераасэнсоўваць у нашым выпадку — гэта і ёсць любіць.*

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота аўтара і з партала творчай моладзі www.artviva.by.**